■ Першае пасяджэнне Савета па культуры пры Міністэрстве культуры адбудзецца на базе Нацыянальнай бібліятэкі 28 сакавіка. На ім будуць разгледжаныя пытанні рэалізацыі кадравай палітыкі і падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы культуры. Акрамя членаў савета, удзельнічаць у пасяджэнні будуць кіраўнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўнікі арганізацый, падначаленых Міністэрству культуры, а таксама кіраўнікі структурных падраздзяленняў міністэрства. Сярод запланаваных выступаў — даклады начальніка аддзела кадравай работы і дзяржаўных узнагарод Мінстэрства культуры Вольгі Германовіч, начальніка аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Марыны Юркевіч, рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталлі Карчэўскай, начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Алены Клімовіч і начальніка галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргея Пішчова.